**Аршанскі раенны выканаўчы камітэт**

г. Орша, вул. Аляксандра Астроўскага, 2
211391, Віцебская вобласць
Тэл/факс 8 (0216) 51 12 12
e-mail: rikorsha@vitobl.by

**Оршанский районный исполнительный комитет**

г. Орша, ул. Александра Островского, 2
211391, Витебская область
Тел/факс 8 (0216) 51 12 12
e-mail: rikorsha@vitobl.by

03.01.2023 №09-15/П-1678

[redacted]

Аршанскі раённы выканаўчы камітэт на Ваш электронны зварот па пытанню замены мовы мемарыяльнай дошкі на будынку дзяржаўнай установы адукацыі ”Сярэдняя школа № 3 г. Оршы імя У.С. Караткевіча“ паведамляе.

Рашэннем Аршанскага раённага выканаўчага камітэта ад 23 чэрвеня 2022 г. № 1103”Аб прысваенні імя дзяржаўным установам адукацыі“ дзяржаўнай установе адукацыі ”Сярэдняя школа № 3 г. Оршы“ было прысвоена імя знакамітага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларускай ССР Караткевіча Уладзіміра Сямёнавіча.

25.11.2022 у дзяржаўнай установе адукацыі адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае адкрыццю памятнай дошкі ў гонар У.С. Караткевіча. Памятная дошка складаецца з дзвюх частак. На першай частцы дошкі размешчаны партрэт пісьменніка і тлумачальны надпіс на рускай мове. Другая частка – урывак з верша У.С. Караткевіча ”У дняпроўскіх хвалях, бы ў калысцы...“ на беларускай мове.

У.С. Караткевіч пісаў свае творы на рускай і беларускай мовах. У гады студэнцтва з 1949 па 1954 год (філалагічны факультэт Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Т. Шаўчэнкі) пісьменнікам былі напісаны творы на рускай мове (аповесць ”Предыстория“, апавяданні ”Скрипка поёт“, ”Клён“, ”Руки“ і іншыя, верш ”Тут будет канал“). Пасля заканчэння ўніверсітэта з 1954 па 1958 год У.С. Караткевіч выкладаў рускую мову і літаратуру.

У адпаведнасці з артыкулам 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляюцца беларуская і руская мовы.

Адукацыйны працэс у дзяржаўнай установе адукацыі ”Сярэдняя школа № 3 г. Оршы імя У.С. Караткевіча“ ажыццяўляецца на рускай мове.

Зыходзячы з вышэйсказанага, замена дошкі на будынку ўстановы адукацыі з’яўляецца немэтазгоднай.

Дадзены адказ на Ваш зварот Вы маеце права абскардзіць у Віцебскі абласны выканаўчы камітэт.

Намеснік старшыні В.С.Калачоў

Загурскі 8 0216 51 24 83